*УДК 615.89(476)+398(=161.3)*

*Д. М. АЛЕКСЕНКА*

# МЕСЯЦ І ЗОРКІ Ў НАРОДНАЙ МЕДЫЦЫНЕ БЕЛАРУСАЎ

*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Мінск, Беларусь,*
*e-mail: darja-aleks2012@rambler.ru*

Рассматривается одна из наиболее архаичных областей традиционной духовной культуры белорусов – народная медицина, которая наряду с представлениями о природе заболеваний и способах их лечения сохраняет веру в силу и влияние на здоровье и жизнь человека небесных объектов. На богатом фактическом материале определяются место, роль и значение луны и звёзд в лечебных ритуалах и заговорных текстах, которые их сопровождают.

*Ключевые слова*: народная медицина, заговоры, небесные объекты, фазы луны, мифопоэтическое мировоззрение, космологические мотивы.

*D. M. ALEKSENKA*

## THE MOON AND THE STARS IN THE BELARUSIAN FOLK MEDICINE

*National Academy of Sciences of Belarus, Center for Belarusian Culture, Language and Literature Research, Minsk, Belarus, e-mail: darja-aleks2012@rambler.ru*

Author of the paper considers one of the most ancient spheres of the Belarusian traditional spiritual culture. It is folk medicine, which includes both ideas of the illness nature and ways of their treatment. It conserves the faith into strengths of the heavenly bodies and their influence on health and life of every individual. Place, role and meaning of the Moon and the stars in the healing rituals accompanied by verbal charms have been defined on the rich factual material.

*Keywords:* folk medicine, charms, heavenly objects, phases of the Moon, mythological and ethic world view, cosmological motifs.

Вывучэнне традыцыйнай культуры беларусаў уяўляе актуальнасць у кантэксце пошукаў адэкватных адказаў выклікам глабалізацыі і звязаных з ёю негатыўных працэсаў уніфікацыі, якія адбываюцца ў свеце. У гэтай сувязі асаблівую цікавасць уяўляе народная медыцына продкаў, якая разам з архаічнымі ўяўленнямі аб прыродзе захворванняў і спосабах іх вылячэння захоўвае веру ў сілу і ўплыў на здароўе і жыццё чалавека нябесных аб’ектаў – сонца, месяца, зорак.

Даследчыкамі сабраны і апрацаваны багаты матэрыял па розных аспектах народнага лячэння [3; 4; 8; 12; 14]. Разам з тым, нябесныя свяцілы ў гэтай галіне не з’яўляліся аб’ектам мэтанакіраванага вывучэння ў айчыннай фалькларыстыцы. Асобныя аспекты, звязаныя з семантыкай і функцыямі месяца, зорак у лячэбных замовах, сустракаюцца ў працах Г. Барташэвіч [3], С. Вяргеенкі [12]. Прычыны звароту да месяца, а таксама яго сувязь з пэўнымі захворваннямі аналізуюцца ў манаграфіі Т. Валодзінай «Цела чалавека: слова, міф, рытуал» [4]. У дадзеным артыкуле робіцца спроба вызначэння месца, значэння і ролі нябесных аб’ектаў (месяца, зорак) у народнай медыцыне беларусаў.

Асаблівай папулярнасцю ў народнай медыцыне карыстаецца месяц, зварот да якога матывуецца прыродай начнога свяціла, што знаходзіцца ў пастаянным змяненні, здольнае да новага нараджэння, абнаўлення. М. Эліадэ адзначаў, што «ўсе касмалагічныя, магічныя і рэлігійныя значэнні і сэнсы, звязаныя з Месяцам, тлумачацца спосабам яго існавання, інакш кажучы, тым, што Месяц з’яўляецца «жывым» і невычарпальным у сваім адвечным абнаўленні і адраджэнні»

© Алексенка Д. М., 2015

[20, с. 298–299]. Да месяца звяртаюцца з просьбамі забраць хваробу і дараваць чалавеку спакой і аблягчэнне: «*Месяц ты, месяц, срэбрыя рожкі, залатыя твае ножкі. // Сыдзі ты, месяц, знімі мой зубны боль, занясі яго ў аблокі. // Мой боль не вялікі, не малы, твая моц велічэзная*» [8, с. 399]; «*Маладзік малады, // барані мяне ад зубоў балення, // ад агню палення, // ад людзей мавення*» [13, с. 460]. Часам у магічныя збавіцелі і саюзнікі выбіраюць зоркі: «*І вам, зорачкі, – на стаянне, а рабу божаму, младзенцу, – на здароўе, вам, зорачкі, – пасвяціці, а рабу божаму, младзенцу, – паспаці*» [12, с. 186].

Эфектыўнасць лячэння цесна звязана з прытрымліваннем пэўных часавых параметраў: здзяйсненне абраду ў дакладна вызначаны час сутак, у пэўныя дні тыдня і ў адпаведнасці з канкрэтнымі квадрамі месяца. Адзначаныя параметры адбіраюцца замаўляльнікам (самім хворым ці знахарам) з тым улікам, каб садзейнічаць рэалізацыі ўстановак рытуалу, скіраванага на вяртанне чалавеку страчанага здароўя, дабрабыту. Як адзначае В. Усачова, найбольш спрыяльным часам з’яўляецца «раніца перад усходам сонца, зара, сам момант з’яўлення сонца, вечар перад заходам сонца, заход, поўнач, пры месяцы (часцей, калі ён прыбывае), калі на небе запальваюцца зоркі…» [19, с. 89]. Вось што сведчаць інфарманты: «*выконваецца ноччу або на світанні*» [12, с. 21]; «*Як змеркаеца, приходзишь, шоб месяц зайшоў и к месяцу говоришь... Як нема месяца, то трэба ў вечэр говорить, в дзень не помогае*» [15, с. 269]; «*Калі будуць бачны зоркі, выведзі хворага на сярэдзіну двара, вазьмі ў правую руку карэньчык, абвядзі кругом хворай шчакі і гавары малітву...*» [13, с. 456].

Прымеркаванне лячэння да пэўнай квадры месяца, як слушна заўважае Т. Валодзіна, абумоўліваецца відам хваробы альбо мэтаю замовы: замовы «на рост», «на здароўе» адносяцца да першай квадры або да поўнага месяца; у працэдурах на «здыманне», «змяншэнне» суб’ект звяртаецца да месяца на «сходзе» [4, с. 370]. На маладзіку, г. зн. у пачатку месячнага цыкла, здзяйснялі лячэнне і замаўленне зубнога болю; такім чынам, тут выкарыстоўвалася ініцыяльная магія, ці магія першага дня [2, с. 146]. Маладому месяцу аддавалі перавагу і пры вылячэнні захворванняў скуры: барадавак [10, с. 249], лішая [7, с. 222; 10, с. 234]; дзіцячых [10, с. 186], венерычных хвароб [12, с. 198]. Верылі таксама, што раслінам, сабраным на маладзіку, перадавалася асаблівая гаючая сіла: «*Найпамацнейша тое зелле, што на маладзіку збірана, і тым больш калі яго збірае недаростак або старая кабета, катора з лет вышла*» [10, с. 170]. Адвар з кары і лісця, сабраных на маладзік з дванаццаці розных дрэў, выступаў у якасці надзейнага сродку ад трасцы [10, с. 262]; супраць жа «ядленцавай трасцы» дапамагаў адвар з ядлоўцавых ягад, сабраных «на веташку», у канцы апошняй квадры [10, с. 264].

Разам з тым, час маладога месяца ў пераважнай большасці выпадкаў трактаваўся як неспрыяльны для загойвання ран. Так, любое мізэрнае раненне цела, атрыманае на маладзік, доўга не зажывала, гнаілася, утварала нарывы, якія загойваліся толькі да наступнага маладзіка [9, с. 51]. У той жа час раны, зробленыя ў трэцяй квадры, хутка зажывалі. Нават рэкамендавалася «*старыя раны і болькі віташком пакратаць, патрывожыць*», каб зажывалі [9, с. 52].

Зрэдку лячэнне адбывалася на «сходніх» днях, у перыяд убывання месяца з надзеяй, калі знікне месяц, знікне і хвароба. Так, збаўленне ад ляку, заікання супастаўлялася з убываннем месяца [12, с. 114, 115]. Паводле народных уяўленняў, каб адрэзаны каўтун не меў непажаданых вынікаў, ён павінен быць выдалены або знішчаны апоўначы, у апошні дзень перад надыходам маладзіка [10, с. 287]. Розныя лекі ад глістоў неабходна даваць у апошняй квадры і ніколі – на маладзіку, бо выкарыстанне лекаў у такую пару толькі ўзбуджае глістоў [10, с. 192]. Аднак забаранялася збіраць зёлкі ў апошнюю квадру, «*прынамсі, першыя тры дні пасля поўні, бо такія зёлкі не дапамагаюць, а шкодзяць*» [10, с. 170].

У беларускай традыцыі шырока распаўсюджаны ўяўленні аб тым, што пад уплывам месяца развіваюцца псіхічныя захворванні. У найбольшай ступені падобнага роду ўяўленні датычаць такой хваробы, як лунатызм. Па гэтай прычыне цяжарнай жанчыне забаранялася спаць перад вакном, «*каб на яе не свяціў месяц, бо дзіця будзе хадзіць па месяцу, бы непрытомнае*» [17, с. 168]. Уяўляецца цікавым, што вылячэнне падобнага захворвання звязвалася зноў-такі з месяцам, святлом месяца і адбывалася на працягу ўсяго месяцавага цыкла: «*На поўню, апоўначы, каб не ведаў хворы, абводзяць крэйдаю на падлозе месячнае святло і потым кладуць хворага на тое месца на*

*цэлую гадзіну. Паўтараць гэта трэба да чацвёртага разу ўвесь месяц і менавіта на поўню, на апошнюю квадру, на маладзіку і на першую квадру*» [10, с. 290].

У народнай лячэбнай практыцы абавязкова прысутнічае і вербальны аспект, калі слова надзяляецца дзейснай матэрыяльнай сілай. Л. Вінаградава сцвярджае, што «ў сістэме ўзаемадзеяння розных кодаў, якія ўтвараюць рытуалы, скіраваныя на збаўленне ад хвароб, вербальны кампанент часта займае найбольш моцную пазіцыю» [5, с. 153]. Даволі часта ўвесь рытуал лячэння складваецца толькі з вымаўлення тэксту: «Такая дамінантная роля славеснай формулы павышае яе рытуальна-магічны статус, паколькі асноўная прагматычная функцыя абраду рэалізуецца, перш за ўсё, цераз слова» [5, с. 153].

Для замоўнага слова як магічнага інструмента народна-медыцынскай практыкі значымымі аказваюцца толькі пэўныя характарыстыкі і параметры, якія адносяцца да хваробы і да збаўлення ад яе пацыента. Што датычыць параметраў часу, то яны адбіраюцца замовамі з тым улікам, каб садзейнічаць ўстараненню немачы з усіх адрэзкаў часу, звесці «да нуля магчымасць хваробы знайці часовы пралаз і ўкараніцца ў жыццё чалавека» [1, с. 602]. Так, напрыклад, у межах сутачнага часу замовы апелююць да ранняй / вячэрняй зорачкі, падчас якіх канстатуецца знішчэнне хваробы: «*і ў раба божага (імя) нікагда не бываць, па ету порачку, па вячэрнюю (раннюю) зорачку*» [7, с. 318]; «*…і штоб не бываць табе ні пад поўнае, ні маладзіком, ні схадком, па ету порачку, па раннюю (або вячэрнюю) зорачку*» [7, с. 227].

Найбольш характэрным для беларусаў спосабам перадачы непарыўнага, замкнёнага часавага кантынуума з'яўляецца пералічэнне ўсіх квадраў месяца, падчас якіх хваробе забараняецца прычыняць шкоду чалавеку: «*Як жа нем сук у дрэві, анямей нямей етага сука і ня ватрыгайся ні маладзіка, ні сходу, ні поўнага месяца*» [7, с. 225]; «*Не памінайся, удару, ты ні ў маладзіку, ты ні ў траццяку, ты ні пад поўнай, ты ні ўсхода, ні ў перакрой*» [7, с. 177]; «*Тут табе не хадзіць, жывата не пушыць ні сходам, ні маладзіком, ні пад поўна, ні сходам, ні маладзіком, ні пад поўна*» [7, с. 236]; «*… так етаму рабёнку прыстрэку, іспугу не бываць ні пад поўна, ні маладзіком, ні сходна, ні на веку вяком*» [7; с. 314]; «*… касцей не ламаць, маёй галаве не шумець і з маладнічком, і ісходнімі днямі*» [12, с. 69].

У імя дабрабыту чалавека немалаважным з'яўляецца і локус адсылу хваробы – "іншы" свет, які прадстаўлены ў замовах «як свет "не-быцця", свет "не-рэчаў", "не-падзей", "не-з'яў» [18, с. 92–93]. У стварэнні вобраза гэтага «іншага» свету, дзе няма ніякіх прымет прысутнасці чалавека, жывёл і ўвогуле жывой прыроды, значную ролю адыгрываюць нябесныя аб'екты. Так, у замовах ад шалу, пералогу, залатніка, рожы хваробу адсылаюць туды, «*… дзе сонца не сходзіць і месяц не сіяе і народ не бывае*» [7, с. 176]; «*… ідзе і сонца не грэець, і месяц не свеціць, і звёзды не глядзяць*» [7, с. 149]; «*… дзе людзі не ходзяць, дзе месяц не свеціць і сонца не грэе*» [12, с. 195]; «*… дзе сонца не свеціць, месяц не ўзыходзіць, пташкі не лятаюць, – туды цябе ссылаю*» [7, с. 233].

У замовах ад зубнога болю зварот да месяца, як слушна заўважае Т. Валодзіна, «па частаце фіксацый і распрацаванасці варыянтаў займае адно з першых пазіцый» [4, с. 189]. Такую заканамернасць можна патлумачыць медыятыўнай роляй месяца паміж светам жывых і светам памерлых: « *– Месяц сіняўскі, замараўскі, ты за морамі бываў? – спытаў маладыстарога. // – Бываў. // – Ты мёртвых людзей відаў? // – Відаў*» [8, с. 398]. Месяц як сведка «таго» свету выступае носьбітам стану анямення, змярцвення, г. зн. адсутнасці жыцця, а значыць, адсутнасці адчування болю, у дадзеным выпадку зубнога.

Неабходна звярнуць увагу на касмалогію лячэбных замоў і ідэю міфапаэтычнага прыпадабнення макракосму (свету) і мікракосму (чалавека): «*Не болит земля, не болит небо, не болит солнце, не болит месяц, и у рабы (имя) почки не ноют, не болят, на это колотьё, на всякое ломотьё, как скажу, так и будет*» [12, с. 107]. Лячэбныя замовы не толькі звязваюць чалавека і светабудову, але яшчэ і падтрымліваюць своеасаблівую раўнавагу першатварэння і знахарскай практыкі: «*Было ў месячка тры братцы: адзін – зоры спатухае, другі – свет адсветае, трэці – урокі знімае з раба божага (імя) з буйнай галавы, з рацівага сэрца, з русых кос, з жоўтых касцей, з ясных вачэй, з белага ліца*» [12, с. 185].

Касмалагічныя матывы, якія ўзаемна праецыруюць макра- і мікракосм, сустракаюцца ў замовах ад залатніка. Разуменне прыроды залатніка як рухомага органа, «які надзелены ўласнай

воляй, па той ці іншай прычыне пакідае сваё месца ў чалавечым арганізме…» [16, с. 98–99], прыводзіць да з’яўлення тэкстаў, у якіх устанаўленне залатніка на яго прыроджаным месцы метафарычна супастаўляцца з паводзінамі месяца і зорак [4, с. 177]: «*Залатнічок, панічок, гніся, віся, на сваём месьці станавіся. Ясён месік занімаецца, спалягаець, спатухаець, дробныя звёзды на ноч занімаюцца, на дзень спалягаюцца, спатухаюцца — спатухнець, спаляжэць рабе божай ета хуртувіна*» [7, с. 244]; «*Як на небе маладзічок, зоркі і балачынкі круг свету ходзяць, расходзяцца і на сваё месца становяцца, так і ты, залатнічок, хадзі, расхадзіся, свайго месца пільнуйся і на сваё месца станавіся — ля пупа, ля пупа, ля пупа*» [7, с. 230].

У лячэбных замовах у якасці дзейсных спосабаў збаўлення ад хваробы фігуруюць разнастайныя сімвалічныя дзеянні, сярод якіх вылучаецца і агароджванне. А. Леўкіеўская адзначае, што сакральнасць «выбудоўваемай» пры дапамозе слова агароджы вызначаецца тым касмічным матэрыялам, з якога яна будуецца [11, с. 29]. Касмічны вобраз агароджвання зоркамі, месяцам, сонцам (матыў «Касмічнае агароджванне») сустракаецца ў замовах ад урокаў, нарадкі, прыстрэку, прыгавору і да т. п., асноўнай прагматычнай інтэнцыяй якіх аказваецца ахова ад уздзеяння злых сіл: «*Сонейкам асвяцісь, месяцам агарадзісь*» [7, с. 294]; «*Сонеўкам асвячусь, // Месяцем агараджусь, // Гадзюкаю падвяжусь // И пристрэку не баюсь*» [15, с. 152]; «*На камень станаўлюся, жалезным тынам абгаражуся, небам накрыюся, дробнымі звёздамі абгаражуся, жаркім сонцам абазрусяı*» [12, с. 215]. Як бачым, замаўляльнік адначасова асвячаецца сонцам, агароджваецца месяцам, зоркамі, накрываецца небам, затыняецца жалезным тынам і г. д., у выніку чаго робіцца недасягальным для злых духаў і людзей.

Своеасаблівай гарантыяй здароўя чалавека выступае немагчымасць ажыццяўлення пэўных падзей ці дзеянняў [1, с. 172]. У шэрагу матываў, у якіх гаворка, у прыватнасці, вядзецца аб нябесных свяцілах, дакладней – месяца, для перадачы гэтай ідэі выкарыстоўваюцца, як правіла, канструкцыі з адмоўнымі параўнаннямі: «*Як табе, маладзіку, жаны ня мець, // Так маім зубам не балець*» [7, с. 186]; «*Маладзік малады, // Твой розум залаты. // Як табе век на зямлі не бываць, // Так век хай мае зубы не баляць*» [7, с. 187].

Ідэя немагчымасці парушэння законаў прыроды ляжыць у аснове сюжэта «Тры браты / цары ніколі не сыдуцца» [15, с. 268]. Гэтыя тры браты / цары суадносяцца з трыма ўзроўнямі прасторы (верх – сярэдзіна – ніз), належаць да трох розных сфер светабудовы (неба – зямлі – мора / падземнага свету) і таму не маюць магчымасці злучыцца: «*Адзін царык – дуб на полі, другі царык – ясны месяц, трэці – камень на моры. Як гэтым царыкам у кучу не схадзіцца, за цясовыя сталы не садзіцца, вінных чар не наліваці, адзін аднаго па бацюшку не ўзываці, так у гэтага раба божага не бушаваць, па касцях не хадзіць, касцей не ламіць, жыл не таміць, крыві не паліць, бакоў не закладаць, к сэрцу не прылягаць, на ларі не ляжаць*» [12, с. 207]; «*У моры рака, а ў дубе чарвяка, на небе месяц. Як гэтым тром братам уместа не схадзіцца, мёд-віно не піць, між сабой не гаварыць, так у рабы божае Ганны зубам не балець, касці не ламіць, крыві не паліць*» [7, с. 181].

Захаванне гэтага прынцыпу (тры сферы светабудовы) адпавядае тэме цэласнасці свету ў замовах і выступае ў якасці ўмовы здароўя канкрэтнага чалавека, што і з’яўляецца канчатковай мэтай лячэбнага рытуалу. І наадварот, парушэнне гэтай цэласнасці пагражае рознымі немачамі [1, с. 474 – 475]: «*На небе месяц высока, у моры камень глыбока, у лесе дуб далёка. Як гэтыя тры браты зыйдуцца да месца, да будуць піць і есці, то тады ў Віці будуць зубы балеці*» [7, с. 183]. Хвароба ў дадзеным кантэксце разумеецца, такім чынам, як парушэнне дыскрэтнасці светабудовы і ўстойлівасці яе матэрыяльнай структуры.

Мадэлюемы замовамі вобраз свету ў цэлым адпавядае традыцыйным уяўленням аб трох’ярусная светабудове з яе верхнім, сярэднім і ніжнім светамі. Заўважым, што ва ўсёй сусветнай міфалогіі надзвычайнай папулярнасцю карысталася «шматузроўневая» мадэль Сусвету: « …сутнасць яе заключаецца ў тым, што светабудова падзяляецца на некалькі светаў, якія знаходзяцца адзін над адным. У вядомай меры яны самастойныя, але пры гэтым надзейна змацаваныя ў адзінае цэлае. Галоўных светаў, як правіла, тры (часта кожны з іх у сваю чаргу падзяляецца на асобныя зоны)» [6, с. 109]. Напрыклад, для Усходу ўніверсальнай лічыцца канцэпцыя трохузроўневага па вертыкалі космасу: «Яе сляды змяшчаюцца ўжо ў Ведах, літаральна пранізаных ідэяй траічнасці светабудовы. Сімволіка траічнасці ў самых разнастайных праяўленнях… звязваецца

з мадэллю свету. Творцы міфаў лічылі: паколькі космас у аснове сваёй траічны, пастолькі траічным павінна быць усё, што мае асабліва свяшчэннае, касмічнае значэнне…» [6, с. 127].

Такім чынам, народна-медыцынскія веды арганічна ўпісваюцца ў кантэкст міфапаэтычнага светапогляду, згодна з якім захаванне ўпарадкаванасці светабудовы, цэласнасці і ўстойлівасці яе матэрыяльнай структуры выступае ў якасці ўмовы здароўя чалавека, непарушнасці яго маральнага і фізічнага стану. Асновай семантыкі народна-медыцынскіх рытуалаў і суправаджальных замоў выступае падтрыманне раўнавагі паміж чалавекам і прыродна-касмічнай сферай. У ролі галоўных памочнікаў чалавека ў народным светабачанні выступаюць нябесныя аб’екты – месяц і зоркі, у зваротах-просьбах да якіх адлюстроўваецца вера чалавека ў іх магічную сілу, уплыў на жыццё чалавека і садзейнічанне ў вылячэнні захворванняў.

## Спіс выкарыстанай літаратуры


1. *Агапкина, Т. А.* Восточнославянские лечебные заговоры в сравнительном освещении: Сюжетика и образ мира / Т. А. Агапкина. – М.: Индрик, 2010. – 824 с.
2. *Байбурин, А. К.* Ритуал в традиционной культуре. Структурно-семантический анализ восточнославянских обрядов / А. К. Байбурин. – СПб.: Наука, 1993. – 242 с.
3. *Барташэвіч, Г. А.* Магічнае слова: Вопыт даслед. светапогляд. і маст. асновы замоў / Г. А. Барташэвіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1990. – 128 с.
4. *Валодзіна, Т. В.* Цела чалавека: слова, міф, рытуал / Т. В. Валодзіна. – Мінск: Тэхналогія, 2009. – 431 с.
5. *Виноградова, Л. Н.* Заговорные формулы от детской бессонницы как тексты коммуникативного типа / Л. Н. Виноградова // Исследования в области балто-славянской духовной культуры. Заговор / отв. ред. Вяч. Вс. Иванов, Т. Н. Свешникова. – М.: Наука, 1993. – С. 153 – 163.
6. *Евсюков, В. В.* Мифы о вселенной / В. В. Евсюков. – Новосибирск: Наука, 1988. – 177 с.
7. Замовы / уклад., сістэм. тэкстаў, уступ. арт. і камент. Г. А. Барташэвіч; рэдкал.: А. С. Фядосік (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларуская навука, 2000. – 597 с.
8. Замовы / уклад.: У. А. Васілевіч, Л. М. Салавей; уступ. арт.: Л. М. Салавей. – Мінск: Беларусь, 2009. – 519 с.
9. Зямля стаіць пасярод свету: Беларускія народныя прыкметы і павер’і / уклад. прадм., пераклад, бібл. У. Васілевіча. – Мінск: Маст. літ., 2010. – Кн. 1. – 574 с.
10. Зямная дарога ў вырай: Беларускія народныя прыкметы і павер’і / уклад. прадм., пераклад, бібл. У. Васілевіча. – Мінск: Маст. літ., 1999. – Кн. 3. – 654 с.
11. *Левкиевская, Е. Е.* Славянский оберег. Семантика и структура / Е. Е. Левкиевская. – М.: Индрик, 2002. – 336 с.
12. “На моры-акіяне, на востраве Буяне…” (лекавыя замовы Гомельшчыны): фальклорна-этнаграфічны зборнік / С. А. Вяргеенка; пад рэд. В. С. Новак. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2009. – 220 с.
13. Народная медыцына: рытуальна-магічная практыка / уклад., прадм. і паказ. Т. В. Валодзінай; навук. рэд. А. С. Ліс. – Мінск: Беларус. навука, 2007. – 776 с.
14. Полацкі этнаграфічны зборнік. Вып. 1. Народная медыцына беларусаў Падзвіння: у 2 ч. / склад. У. А. Лобач, У. С. Філіпенка. – Наваполацк: ПДУ, 2006. – Ч. 1. – 147 с.
15. Полесские заговоры (в записях 1970–1990 гг.) / сост., подготовка текстов и коммент. Т. А. Агапкиной [и др.]. – М.: Индрик, 2003. – 752 с.
16. *Проценко, Б. Н.* Духовная культура донских казаков. Заговоры, обереги, народная медицина, поверья, приметы / Б. Н. Проценко. – Ростов н/Д: Изд-во Рост. ун-та, 1998. – 322 с.
17. *Сержпутоўскі, А. К.* Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А. К. Сержпутоўскі. – Мінск: Універсітэцкае, 1998. – 301 с.
18. *Страхов, А. Б.* О пространственном аспекте славянской концепции небытия / А. Б. Страхов // Этнолингвистика текста. Семиотика малых форм фольклора: тезисы и предварительные материалы к симпозиуму / Ин-т славяноведения и балканистики АН СССР; редкол.: Вяч. Вс. Иванов [и др.]. – М., 1988. – Ч. 1. – С. 92 – 94.
19. *Усачева, В. В.* Словесные формулы в народной медицине славян / В. В. Усачева // Этнолингвистика текста. Семиотика малых форм фольклора: тезисы и предварительные материалы к симпозиуму / Ин-т славяноведения и балканистики АН СССР; редкол.: Вяч. Вс. Иванов [и др.]. – М., 1988. – Ч. 1. – С. 88–92.
20. *Элиаде, М.* Трактат по истории религий: в 2 т. / М. Элиаде. – СПб.: Алетейя, 2000. – Т. 1. – 394 с.


*Паступіў у рэдакцыю 27.05.2014*